# Што пакажуць на мультыпраекце да 90-годдзя з дня нараджэння Станіслава Лема?

11.10.2011, 9:20 Культура

- **Алесь Сухадолаў, TUT.BY**

**11 кастрычніка а 17-й гадзіне ў галерэі "Лабірынт" Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі адбудзецца ўрачыстае адкрыццё міжнароднага мультыпраекта "Лемарыс", які прысвечаны 90-годдзю з дня нараджэння Станіслава Лема. На адкрыцці з адмысловым перфомансам выступіць пластычны тэатр "ІнЖэст" (упершыню ў Нацыянальнай бібліятэцы!).**

Станіслаў Лем – польскі пісьменнік, сатырык, філосаф, фантаст і футуролаг, кнігі якога перакладзены больш чым на 30 моў свету. Ён па праву лічыцца адным з самых выдатных пісьменнікаў-філосафаў XX стагоддзя. Яго творы адносяць да класікі фантастычнага жанру.

Пісьменнік ствараў дзіўныя, небывалыя сусветы, яго героі сутыкаюцца з невядомымі для чалавека істотамі, вырашаюць найважнейшыя пытанні чалавечага быцця, губляюць і знаходзяць сябе ў бясконцых прасторах космасу. Творы Станіслава Лема вырываюць чытача са звыклага асяроддзя і прымушаюць паглядзець на сваё жыццё пад іншым ракурсам.

У аснове мультыпраекта "Лемарыс" – міжнародная мастацкая выстаўка, якая раскінецца на тры галерэі Нацыянальнай бібліятэкі: "Ракурс", "Лабірынт" і "Атрыум". Касцяк выстаўкі складаюць графічныя творы Даніэля Мроза, найвядомейшага польскага ілюстратара кніг С. Лема, мастака з Санкт-Пецярбурга Аляксея Андрэева, што працуе ў рэчышчы камп'ютарнай графікі, а таксама рэпрадукцыі аўтарскіх малюнкаў самога С. Лема. Экспазіцыю дапоўняць творы беларускіх аўтараў, выкананыя ў самых розных жанрах: жывапіс, фота, кераміка, скульптура, камп'ютарная графіка. У выставе прымаюць удзел мастакі: Мікалай Бушчык, Сяргей Лапша, Сяргей Балянок, Віктар Ціханаў, Фёдар Ястраб, Андрэй Плясанаў, Вадзім Качан і інш.

*Творы Даніэля Мроза*







*Творы Аляксея Андрэева*






*Творы беларускіх аўтараў*






Мультыпраект "Лемарыс" таксама ўключае ў сябе шэраг цікавых кніжных выставак.

Выстаўка “Лемарыс” працягнецца да 4 лістапада.